# ДЗЯЦІНСТВА ЯК УВАСАБЛЕННЕ МІФАЛАГЕМЫ «СТРАЧАНАГА РАЮ» Ў АПОВЕСЦІ ЯНА БУЛГАКА «ДОМ»

**М. В. Грудзінава**

Дзяцінства з’яўляецца адной з самых значных анталагічных катэгорый, якая даўно ўжо атрымала статус навуковай праблемы і асэнсоўваецца ў межах філасофіі, культуралогіі, сацыялогіі, гісторыі, псіхалогіі і іншых навуковых дысцыплін. Напрыклад, псіхааналітыка звязвае раскрыццё феномена дзяцінства з надзеяй на абнаўленне, з шансам выправіць памылкі, а значыць выправіць і само жыццё (менавіта псіхааналіз у XX стагоддзі стаў прычынай вялікай цікавасці да праблемы дзяцінства).

Для літаратуры і літаратуразнаўства дзяцінства – вельмі каштоўны матэрыял, які дае магчымасць паказаць эвалюцыю героя, карані ягоных учынкаў і светабачання, а разам з тым дзяцінства ў мастацкім творы –

гэта рэфлексія над падзеямі мінулага ў цэлым і спроба прадбачыць будучыню.

Цікавасць да феномена дзяцінства актуалізуецца звычайна ў найбольш крызісныя перыяды ў гісторыі чалавецтва.

Адчуванне невядомасці і хісткасці чалавечага існавання паклікала да жыцця вялікую колькасць літаратурных твораў, у якіх цэнтральнае месца займае свет дзіцяці (адсюль тэрмін – *метафізіка дзяцінства*). Падобныя тэндэнцыі характэрныя для рускай, беларускай і польскай літаратуры ХХ стагоддзя як даваеннага, так і пасляваеннага часу. У многім гэта тлумачыцца тым, што такая літаратура «вяртала чытачу адчуванне нармальнасці жыцця» [8, с. 227].

Пісьменнікі ў сваіх творах выбудоўваюць асобы тып рэальнасці, якую можна назваць райскай, але яна, на жаль, засталася ў мінулым. Туга па мінулых шчаслівых часах у агульнакультуралагічным плане знайшла сваё ўвасабленнне ў міфалагеме «страчанага раю», адной з форм рэалізацыі якой і з'яўляецца дзяцінства.

Паняцце міфалагемы ўзнікла ў межах неаміфалагічнай школы літаратуразнаўства, якое звярнулася да вывучэння феномена міфа, а таксама, абапіраючыся на тэорыю К. Юнга аб архетыпах, прапанавала сваю канцэпцыю разумення культуры (і літаратуры ў прыватнасці). Згодна з прапанаванай тэорыяй, у аснове культурных з'яў ляжаць агульначалавечыя універсаліі, якія знаходзяць сваё ўвасабленне ў міфалагемах.

Існуе дастаткова шмат дэфініцый дадзенага паняцця (вывучэннем міфалагемы займаліся А. Альварэс дэ Міранда, М. Эліядэ, М. Лотман і інш.): так, пад міфалагемай разумеюцца пэўныя ўстойлівыя і паўтаральныя вобразы, якія ў канцэнтраваным выглядзе адлюстроўваюць рэчаіснасць.

Пры такім разглядзе ўзнікае неабходнасць размежавання блізкіх паняццяў – архетыпу і міфалагемы. Архетып, як зазначае расійскі даследчык Цялегін, адносіцца да сферы псіхічнага, «гэта першасная схема, пазбаўленая якога-небудзь зместу, якая праяўляецца ў псіхічным жыцці» [4, с. 15]. Сваё ўвасабленне архетып атрымлівае ў вобразах, якія нібы запаўняюць пустую прастору (адсюль розныя вобразы і характары мы можам аб'яднаць адным архетыпам).

У адрозненне ад архетыпу, міфалагема належыць да сферы філалогіі, служыць раскрыццю сэнсаў мастацкага твора і ўяўляе сабой першавобраз, канцэнтрат пэўнага міфа, яго семантычнае ядро. У старажытнасці міф з'яўляўся спосабам спазнання і асэнсавання рэчаіснасці, але і зараз ён здольны дастаткова глыбока раскрыць сутнасць з'явы, а то і сказаць пра рэчаіснасць куды больш, чым рацыяналістычныя тэорыі, таму што міф апелюе да зместаў, якія немагчыма растлумачыць з дапамогай фармальнай логікі.

Міфалагема – гэта код, які неабходна дэшыфраваць (менавіта гэтую ўласцівасць эксплуатуюць вытворцы рэкламы, выкарыстоўваючы найбольш распазнавальныя міфалагемы). Узноўленая інфармацыя стварае дадатковы кантэкст для прачытання мастацкага твора і расстаўляе неабходныя акцэнты.

Адной з самых распаўсюджаных міфалагем у культуры з'яўляецца міфалагема «страчанага раю» і яе варыянты (міфалагема «залатога веку»). Міф аб раі прысутнічае ў многіх культурных традыцыях: Элізіум – у антычнай міфалогіі; Вырый – у славянскай язычніцкай традыцыі; Вальхала – у германа-скандынаўскай міфалогіі; краіна Дзільмун – у шумерскіх міфах; Эдэмскі сад, апісанне якога мы сустаркаем у Старым Запавеце і які адпавядае стану чалавецтва да спазнання дабра і зла; рай як Царства Божае, што сцвярджае перамогу над часам і смерцю і выступае процівагай пеклу, – у хрысціянскім вучэнні; Сукхаваці – у буддызме.

Часцей за ўсё рай усведамляецца не толькія як трансцэндэнтная катэгорыя, але і знаходзіць сваё выяўленне ў канкрэтных вобразах: сад, апісанне якога з'яўляецца адлюстраваннем чалавечага ўяўлення аб прыгажосці прыроды; нябёсы, цудоўная краіна ці горад. Першымі літаратурнымі ўвасабленнямі міфалагемы з'уяляюцца творы антычных аўтараў – Гесіёда, Авідзія і Вергілія.

Разам з тым, міфалагема ўяўляецца нам даволі складаным комплексам: так, з міфалагемай «страчанага раю» непарыўна зніταваны вобраз выгнанніка, часавая апазіцыя «тады» і «цяпер», туга па згубленым і імкненне вярнуцца (матыў вяртання).

Зварот да міфалагемы «страчанага раю» звязаны з канкрэтным гістарычным кантэкстам: у XVIII і XIX стагоддзях – са стратай незалежнай дзяржавы (адсюль – туга А. Міцкевіча і В. Дуніна-Марцінкевіча па старасвецкім мінулым, якое ўяўлялася пісьменнікам «залатым часам»). У XX стагоддзі адчуванне катастрафізму стала часткай светабачання і светаадчування, бо трагічныя падзеі закранулі абсалютна кожнага.

Трагічны падтэкст міфалагемы заключаецца ў тым, што вярнуцца да раю немагчыма, бо яго ўжо няма: пасля спазнання дабра і зла Эдэм знік. У дадзеным міфе дакладна ўвасоблена лінейнае разуменне часу – нічога не вяртаецца назад.

Немагчымасць вярнуцца да мінулага і катастрафічнасць свайго часу адчуваў і Ян Булгак, які страціў і сваю краіну, і сваё роднае гняздо. Пісьменнік бачыў, як змяніўся свет і параўноўваў з тым, што было, таму натуральна і заканамерна, што міфалагема «страчанага раю» сустракаецца ва ўсіх літаратурных творах майстра. Варта адзначыць, што ў сваёй літаратурнай дзейнасці Булгак арыентаваўся на традыцыі XIX стагоддзя,

для якога разглядаемая міфалагема – распаўсюджаная і характэрная мастацкая з'ява (у Міцкевіча – Сапліцова, Аркадыя ў сентыменталістаў).

Дзяцінства (як форма рэалізацыі міфалагемы) з'яўляецца магістральнай тэмай аўтабіяграфічнай аповесці «**ДОМ**» **(1937)**, якая складаецца з 18 невялікіх замалёвак, што раскрываюць розныя абліччы дома і аб'ядноўваюцца ў цэлае вобразам галоўнага персанажа, хлопчыка Яцка. Міфалагема як літаратуразнаўчая катэгорыя мае сваю структуру: яна складаецца з сітуацыі, якая ўзнаўляецца пры расшыфроўцы, і дамінанты, прадстаўленай сімвалам, знакам, асацыяцыяй, матывам і інш. Такой дамінантай міфалагемы «страчанага раю» ў Яна Булгака з'яўляецца вобраз-сімвал дома.

Аповесць фактычна з'яўляецца ўзнаўленнем міфа аб страчаным раі. Яцак жыве ў сонечным, радасным свеце ў поўнай гармоніі з наваколлем, яго свядомась – tabula rasa, ён яшчэ не ведае ні дабра, ні зла.

Аднак у творы няма лінейнага часу, няма антыноміі «тады//цяпер», а ёсць цудоўныя моманты і здарэнні, якія напоўнілі дзяцінства Яцка сапраўдным шчасцем: гэта і сонечны дзень, і імяніны маці, і начная язда, поўная жахаў і прыгодаў, і букецік «сапфіравых» васількоў, і першы веснавы спеў жаваранка, і гудзенне чмялёў у чаборы, і слёзы першай страты, і ўражанні ад першай самастойна прачытанай кнігі. Для Яцка рай мае сваё аблічча – сад, у якім кіпіць жыццё; беларускія краявіды і мясціны. Сімптаматычна, што свой твор Булгак прысвяціў землякам, якія з-за вайны **страцілі** свае родныя гнёзды.

Разам з тым, «ДОМ» – гэта аповесць аб першых і самых моцных уражаннях і расчараваннях, а таксама расповед аб першым граху і спакусе (сам аўтар так называе адзін з раздзелаў, адсылаючы да адпаведнага біблейскага кантэксту), аб граху спазнання дабра і зла (сталенні героя), з якім прыходзіць разуменне, што нічога ўжо не вернецца. Рай дзяцінства – таксама: «Але гэтае шчасце знаходзіцца не ў жыцці, толькі каля жыцця, за яго дужкамі» [6, с. 38].

### Литература


1. *Баргановіч І.* Беларусь у паэтычнай інтэрпрэтацыі Яна Булгака (паэма "Moja ziemia", 1919) // Acta Albaruthenica. 2005. №5. С. 38–43.
2. Беларуская міфалогія: энцыкл. слоўнік / А. Прохараў [і інш.]. Мн., 2006.
3. *Булгак Я.* Край дзіцячых гадоў. Мн., 2004.
4. *Телегин С.М.* Термин «мифологема» в современном российском литературоведении // Архетипы, мифологемы, символы в художественной картине мира писателя: Материалы Междунар. заоч. науч. конф. Астрахань, 2010. С.14–16.
5. *Тресиддер Дж.* Словарь символов. М., 1999.
6. *Bułhak J.* D.O.M. Wilno, 1937.
7. *Bułhak J.* Moja ziemia. Wilno, 1919.
8. *Kwiatkowski J.* Dwudziestolecie międzywojenne. Warszawa, 2008. S. 225–332.